Зцвярджаю
Начальнік аддзела адукацыі
Дзяржынскага райвыканкама
В.І.Матусевіч ____________

**Раённая алімпіяда па беларускай мове**
**лінгвістычны конкурс 9 клас, 2007 год**

**Заданне 1.** Прачытайце радкі з верша Ф.Багушэвіча "Балада". Выпішыце фанетычныя словы, у саставе якіх ёсць два санорныя гукі.

**Балы:** *+0,5 бала за адно правільна падкрэсленае фанетыннае слова;*
*-0,5 бала за няправільнае слова.*

| | |
|---|---|
| У гаспадарцы ж - страта на страце:<br>Зараза на быдла, пажар і злодзей...<br>Скаціна пала, гумно згарэла,<br>Коні пакралі ў час рабочы. | А тут і плата на выкуп прыспела,<br>Зборшчык, як дым той лезе ў вочы.<br>Прадаў Ануфры ўсю худобу,<br>Выплаціў выкуп, падаткі, збор. |

**Заданне 2.** Запішыце 10 аднаскладовых назваў гарадоў і мястэчак Беларусі
Максімальная колькасць балаў - 3

**Заданне 3**. Запішыце без назваў дзень за днём пяць дзён тыдня.
Максімальны бал = 2,5 *(0,5 бала за кожнае слова)*

**Заданне 4.** Запішыце, якое ранейшае значэнне выяўляе слова *'худоба'* ў тэксце да задання 1? *(2 балы).* Як можна кваліфікаваць гэтае слова: *дыялектызм, архаізм, гістарызм, неалагізм? (2 балы)* Запішыце.

**Заданне 5.** Выпішыце з тэксту (заданне 1) у алфавітным парадку ўсе назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць канчаткі -у (-ю).
Балы: *0,5 бала за кожнае слова + 0,5 бала за правільнае размяшчэнне слоў у алфавітным парадку.* |

**Заданне б.** Запішыце з адпаведнымі прыкладамі ўсе магчымыя сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў беларускай мове для выражэння трывальных (відавых) значэнняў дзеясловаў.
Максімальны бал = 5 балаў *(4 балы за названыя сродкі (1 назва = 1 бал) + 1 бал заўсе прыведзеныя прыклады)*

**Заданне 7.** Выпішыце канструкцыі, якія знаходзяцца па-за межамі сістэмы словазлучэнняў.
Балы: *0,5 бала за правільна падкрэсленую канструкцыю;0,5 бала за няправільна падкрэсленую канструкцыю*
Па-юнацку бадзёра, лататы даваць, рыхтавацца да алімпіяды, уздоўж лесу, горад Мінск, бадай поўны, іскрысты снег, паварот направа, адказваць на пытанні, дзень марозны, пайшлі адпачываць, жменя ягад.

**Заданне 8.** Прыдумайце і запішыце мінімальныя кантэксты, у якіх выказванне *Ну і пагода сёння!* перадавала б супрацьлеглыя эмоцыі. Патлумачце семантыку .. выказвання ў кожным кантэксце.
Максімальны бал = *4 балы (2 балы за адзін кантэкст і значэнне + 2 балы за другі кантэкст і значэнне)*

**Заданне 9.** На адной з алімпіяд пры напісанні водгуку вучні сканструявалі наступныя сказы. Выявіце і растлумачце памылкі, дапушчаныя ў сказах.
Максімальны бал - 4 балы *(1 бал за кожную выяўленую і растлумачаную памылку)*
1. Сказы Р.Барадуліным выкарыстаны як простыя, так і складаныя, не ўскладнены зваротамі, мала мастацкіх эпітэтаў. 2. Вельмі рэдка сустракаеш памяншальна-ласкавыя словы. 3. А тое, што жыццё складанае, можна ўбачыць : прыкладу сваіх бацькоў. Яны працуюць як трутні, каб у сям'і было неабходнае. 4. Другая запаведзь, якая мне ўспомнілася, чытаючы верш, — не кажы няпраўды!

**Заданне 10.** Напісаць водгук на верш Я.Купалы “Спадчына”

**Заданні падрыхтаваны вядучым спецыялістам аддзела адукацыі А.Ц.Юркевіч**

**ДАВЕДКІ**
9 клас

| **Заданне** | **1** | **2 3** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **6** | **5** | **2,5** | **4** | **3** | **5** | **2** | **4** | **4** | **6** | **41,5** |

**Заданне1 Балы:** *+0,5 бала за адно правільна падкрэсленае фанетычнае слова; -0,5 бала за няправільнае слова.* Усяго = 6 *балаў*

**Каментар.** Для выканання задання неабходна дакладна ўсведамляць значэнне тэрміна "фанетычнае слова" - гэта група складоў, якая *1)* аб'яднана адным агульным націскам; *2)* адпавядае аднаму або некалькім лексічным адзінкам. Так, у першым радку *У гаспадарцы ж* -***страта на страце...*** можна выдзеліць тры фанетычныя словы: 1) *у-гаспадарцы-ж 2) страта* 3) *на-страце.* Службовыя словы (прыназоўнікі, злучнікі, многія часціцы) не маюць самастойнага націску, а таму зліваюцца з самастойнымі словамі, што стаяць побач, у адно фанетычнае слова.

**Адказ.**

Неабходна было выпісаць наступныя фанетычныя словы: *на страце, на бы́дла, і злодзей, гумно, згарэла, пакралі, на выкуп, прыспела, як дым, ў вочы, прадаў, Ануфры.*

**Заданне 2**

**Брэст, Глуск, Клецк, Бобр, Ельск, Мінск, Мір, Пінск, Рось, Свір, Шклоў.**

**Заданне** 3

**Максімальны бал** = **2,5** *(0.5 бала за кожане слова)*

Дзень першы: *пазаўчора,* дзень другі: *учора,* дзень трэці: *сёння,* дзень чацвёрты: *заўтра,* дзень пяты: *паслязаўтра (пазаўтра).*

**Заданне 4**

**Адказ.** Слова *'худоба'* ў тэксце да задання 1 — *'хатняя маёмасць'* (2 балы). Гэта ***архаізм*** *(2 балы).*

**Каментар.** Архаізмы - гэта ўстарэлыя назвы існуючых сёння прадметаў і з'яў. У сучаснай мове такія словы заменены новымі словамі, якія з'яўляюцца сінонімамі.

**Заданне 5**

**Балы:** *0,5 бала за кожчае слова + 0,5 бала за правільнае размяшчэнне слоў у алфавітным парадку.*

*Выку, дым, збор, пажар, час.*

**Заданне 6**

Максімальны бал = 5 балаў *(4 балы за названыя сродкі (1 назва = 1 бал) + 1 бал за ўсе прыведзеныя прыклады)*

| **№** | **Сродкі** | **Прыклады** |
|---|---|---|
| 1 | Суфіксацыя | Абыграць – абыгрываць |
| 2 | Мена тэматычных галосных | Рашаць – рашыць |
| 3 | Прэфіксацыя | Рабіць – зрабіць |

| | | |
|---|---|---|
| 4 | Націск | Насыпаць - насыпаць |

**Заданне 7**

**Балы:** *0.5 бала за правільна падкрэсленую канструкцыю:*
*-0.5 бала за няправільна падкрэсленую канструкцыю.*

**Каментар.** Неабходна падкрэсліць толькі тыя спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі. Гэта: фразеалагізм *лататы даваць,* прыназоўнік з назоўнікам *уздоўж лесу,* часціца з прыметнікам *бадай поўны,* дзейнік і выказнік *дзень марозны.*

**Адказ.**

Па-юнацку бадзёра, *лататы даваць,* рыхтавацца да алімпіяды, *уздоўж лесу.* горад Мінск, *бадай поўны,* іскрысты снег, паварот направа, адказваць на пытанні, *дзень марозны,* пайшлі адпачываць, жменя ягад.

**Заданне 8**

**Максімальны бал** = ***4 балы*** *(2 балы за адзін кантэкст і значэнне +*
*2 балы за другі кантэкст і зпачэнне)*

**Каментар.** Выказванне *Ну і пагода сёння!* у залежнасці ад кантэксту можа перадаваць як станоўчыя (захапленне) эмоцыі, так і адмоўныя (агіда).

**Адказ.** *Ну* ***і пагода*** *сёння,* Ян Аляксеевіч, а? Ты толькі паглядзі, ты толькі палюбуйся! *(Я.Скрыган).* У гэтым сказе значэнне выдзеленага выразу - *'захапленне'.*

- *Ну* ***і пагода*** *сёння!* - папраўляе жанчына мокрую пасмачку валасоў, што выбіваецца з-пад башлыка. - Не было, не было - дачакаліся. Чэша, сячэ - канца не відно. Лішні ўжо дождж. Крый Божа яшчэ трохі пахлябешча, натворыць гнілля. *(Л.Калодзежны)* У гэтым сказе значэнне выдзеленага выказвання - *"незадавальненне”*

**Заданне 9.**

**Максімальны бал = 4 балы**

*(1 бал за кожную выяўленую і растлумачаную памылку)*

**Каментар-адказ.** У першым сказе слова *"мастацкіх"* з'яўляецца лішнім, паколькі ***эпітэт*** - гэта і ёсць *мастацкае* азначэнне, якое вобразна, эмацыянальна характарызуе чалавека, прадмет, жыццёвыя з'явы, падзеі. У другім сказе выкарыстаны недарэчны тэрмін-неалагізм "памяншальна-ласкавыя словы", які павінен быць заменены або тэрмінам "словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі", або "словы са станоўчай канатацыяй". У трэцім сказе параўнанне *"як трутні"* не адпавядае логіцы выказвання, паколькі слова *труцень* у пераносным значэнні - 'той, хто жыве за кошт чужой працы'. У чацвёртым сказе няправільна ўжыты дзеепрыслоўны зварот *"чытаючы верш",* які павінен адносіцца да даго, хто гаворыць, а не да слова *запаведзь.* Трэба: Другая запаведзь, якая ўспомнілася мне, калі я чытаў верш, — не кажы няпраўды!